

## ПАПЯРОВЫЯ КРЫЛЫ

У горадзе Н. жылі тоўстыя людзі. Яны пастаянна штосьці елі: дома, па дарозе на працу, за рабочым сталом... Склалася такое адчуванне, што яны жывуць, каб есці, а не наадварот. Дзяўчынка, якая расла ў такой тоўстай сям'і, аднойчы ўбачыла праз акно птушку, што бесклапотна кружляла ў небе. І ёй таксама захацелася ўзляцець. Спачатку малая паспрабавала гэта зрабіць пры дапамозе паветраных шарыкаў. Але вяроўка не вытрымала яе вагі і парвалася. Шарыкі ўзняліся ў неба. Потым яна спрабавала ўзляцець пры дапамозе паветранага цмока, дэльтаплана, але паўтарылася тое ж самае... Дзяўчынка ў роспачы ляжала на зямлі... У гэты момант да дрэва падляцела птушка і адшчыкнула ад галінкі зімнюю ягаду. І зноў знікла ў небе. Дзяўчынка прыбегла дадому, набрала ў міску ажын ды суніц — і пачала рабіць крылы з кардона і газетнай паперы. Калі растаў снег, яны былі гатовыя. А лішніх кілаграмаў як не было. І яна ўзляцела...

Гэты ролік пра тоўсты горад дагэтуль круціцца ў мяне ў галаве, не адпускае. Часам я таксама, як тая дзяўчынка, адчуваю сябе непад'ёмнай. Толькі замест лішніх кілаграмаў мне не даюць адарвацца ад зямлі «рамкі». Некаторыя — навязаныя яшчэ з дзяцінства. Некаторыя — набытыя ў свядомым узросце.

Адна з іх — гэта «сіндром выдатніцы», перфекцыянізм. Трэба ўсё зрабіць ідэальна, не зважаючы на свой унутраны стан. Ніхто не вучыў прыслухоўвацца да сябе, свайго арганізма, унутранага голасу. Галоўнае, «кроў з носу» выканаць пастаўленую задачу — нават калі яе паставіла перад сабой ты сама. А пасля — што будзе, тое будзе. І я такая не адна.

Некалькі дзён таму ў сацыяльных сетках знаёмая выклала фотаздымак з бальнічнай ежай. «Вось быццам бы разумная дзяўчынка, — піша яна, — ведаю, што лепш вучыцца на чужых памылках. Што сябе трэба любіць. Што незаменных — няма. Што хворы ты не патрэбны нават самому сабе. І што калі цябе не стане, ужо праз месяц пра цябе забудуць. Усё ведаю, так. І ўсё роўна бягу. «Завалілася». Цяпер сама сабе абяцаю, што як толькі ачуняю, пачну новае — свядомае, спакойнае жыццё».

«Рамкі», якія не даюць адарвацца ад зямлі, у кожнага свае. Муж прыяцелькі, напрыклад, убіў сабе ў галаву, што дзецям патрэбныя выключна багатыя бацькі. Таму працуе не апускаючы рук, з ранку да позняга вечара. Бачыць дачку некалькі гадзін на суткі.

Іншы ўсе свае найлепшыя гады будаваў кватэру. Каб выплаціць крэдыты і даўгі, працаваў на некалькіх работах. Нікуды не ездзіў, нікуды не хадзіў — адным словам, свету белага не бачыў. Нядаўна сустрэлася ў метро, аказваецца, ён развёўся з жонкай. Цяпер здымае кватэру. І працягвае выплачваць крэдыт за двушку, у якой жыве былая жонка з малым сынам.

...Калі халасцяк паміраў ва ўзросце дзевяноста гадоў, хтосьці запытаўся ў яго:

— Ты так і не ажаніўся, чаму?

— Не тое, каб я быў супраць шлюбу, проста шукаў ідэальную жанчыну. І так, у пошуках, праляцела ўсё маё жыццё.

— Але няўжо на ўсёй велізарнай планеце, населенай мільёнамі людзей, ты не змог адшукаць адну-адзіную ідэальную жанчыну?

— (Сляза скацілася па шчацэ старога.) Не, адну я ўсё ж такі знайшоў.

— Тады што ж адбылося, чаму вы не пажаніліся?

— Тая жанчына таксама шукала ідэальнага мужчыну...

Рамка — «ганарлівасць», рамка — «прага да славы і выгады», рамка — «а што людзі падумаюць», рамка — «так трэба» (а каму?), рамка — «эгаізм»... Гэтыя рамкі-пачуцці не даюць адчуць лёгкасць, адарвацца ад зямлі.

...Мама (як кажуць яблык ад яблыні) учора ўпершыню ў жыцці спаліла грэчку. Расстроілася. Тэлефануе: «Са мной раней ніколі такога не было!» — «Боже, какой пустяк, сделать хоть раз что-нибудь не так», — адказала я ёй словамі з песні. І перасланула той самы ролік пра тоўсты горад... Да вясны засталося менш як 140 гадзін. За гэты час цалкам можна паспець змайстраваць сабе крылы...

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
*nadzieja@zviazda.by*

**Сямейная газета**

**Выпуск № 4 (71)**

■ Прэм'ера рубрыкі «Бацькоўскі клуб»

**Першае правіла Бацькоўскага клуба — не казаць пра Бацькоўскі клуб. Другое правіла Бацькоўскага клуба — нідзе не казаць пра Бацькоўскі клуб. Трэцяе правіла Бацькоўскага клуба — не звяртаць увагі на першыя два правілы... «Бацькоўскі клуб» — новая рубрыка, у якой разважаюць, спрачаюцца і дыскутуюць таты розных пакаленняў нашай рэдакцыі. Вітайце: загартаваны 20 гадамі сямейнага жыцця Сяргей КУРКАЧ і яго маладзейшы калега Валянцін БОЙКА. Без пустаслоўя і сюсюкання — толькі суровы мужчынскі погляд на рэчы. Мінімум эмоцый — максімум аргументаў. Пакуль не пераможа чыйсьці пункт гледжання.**

# ШУКАЙЦЕ, ПАНЕНКІ, У ПЫЛЕ «БРЫЛЬЯНТЫ»



Гэты цудоўны кадр адкрываў выстаўку фотаздымкаў «Місія таты», якую ладзіў Фонд ААН у галіне народанасельніцтва ў Беларусі. (Фота журналісцкага агенцтва «Таранціны і сыны»).

## Сёння мы прапануем вам свой погляд на крытэрыі «мужчынскасці»

**«Мужчыны з Марса, а жанчыны з Венеры». Так называецца вядомая кніга амерыканскага псіхолага. І нездарма: мы настолькі розныя, што версія аб паходжанні мужчын і жанчын з розных планет не выглядае перабольшаннем. Аднак нас усё роўна цягне адно да аднаго. Прычым на стадыі закаханасці мы цэнім у партнёрах адныя рысы, а ў сямейным жыцці — іншыя. Хто такі сапраўдны мужчына? Суровы «альфа-самец», што цэлымі днямі «косіць» грошы? Або сем'янін, які варыць дзецям кашу і мяняе пялюшкі? Заўзяты прагматык або рамантычны летуценнік?**

***(Заканчэнне на 6-й стар. «СГ».)***

■ Настальгія

# Казачкі з антрэсоляў

**Аднойчы мама ў дэкрэце і рэжысёр па адукацыі Наталля ЛЕВАНАВА знайшла ў бацькоўскім доме праектар са стужкамі. І проста не змагла пакласці гэты скарб назад на антрэсолю. Сёння разам з сябрамі-аднадумцамі — прафесійнымі музыкамі і акцёрамі — яна агучвае дыяфільмы свайго дзяцінства і тым самым дорыць ім другое жыццё.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Наталля ЛЕВАНАВА і Андрэй ЕЎДАКІМАЎ лічаць праектар і дыяфільмы светлым промнем свайго савецкага дзяцінства.

Выключаецца святло — і на экране з'яўляецца знаёмы з дзяцінства надпіс «Студыя «Дыяфільм». «...А зараз мы вам пакажам і раскажам смешную, кранальную і павучальную казачку, — таямнічым голасам інтрыгуе Наталля дзетак і іх бацькоў. — Называецца яна «Слон Хортан выседжвае яйка». Яна была напісана дзякуючы... парыву ветру. Як? А так! Жыў у Амерыцы чалавек. Яму вельмі падабалася маляваць катоў, птушак, чарапах... Аднойчы ў пакоі, дзе ён працаваў, адчынілася акно. Вецер закружыў паперкі, што ляжалі на стале. Маленькі малюначак слана апынуўся на падлозе над вялікім малюнкам дрэва. Чалавек засмяяўся і напісаў казку пра слана, які залез на дрэва. Імя гэтага чалавека Тэадор Сьюз Гайзель. Аднак пад казкай ён падпісаўся іншым, выдуманым, імем — Доктар Сьюз, а слана назваў Хортанам, у гонар свайго аднакласніка...»

***(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)***